лад, для студэнтаў ТТЛП, ЛГФ рыхтуюцца тэксты па "Даведніку майстра лесанарыхтовак" (Матвейка А.П., Федарэнчык А.С., Завойскіх Г.І.), "Лясная піралогія з асновамі радыеэкалогіі" (Рыхтэр І.Э.), "Экалогія з асновамі метэаралогіі" (Ражкоў Л.М.); для студэнтаў хімічных факультэтаў скарыстоўваюцца тэксты з вучэбнага дапаможніка "Асновы агульнай хіміі" (Новікаў Г.І., Жарскі І.М.).

Так, скарыстоўваючы комплекс інавацыйных метадаў, з дапамогай цэлага шэрагу дадатковых дысцыплін (псіхалогіі, логікі, педагогікі, філасофіі, літаратуры да таго і спецыяльных) праз родную мову выхоўваецца высокаінтэлектуальная маўленчая асоба.

УДК 808.26-07

Н.Я.Савіцкая, старшы выкладчык
кафедры беларускай мовы

## ВЫКАРЫСТАННЕ ПСІХАЛАГІЧНЫХ АСАБЛІВАСЦЕЙ СТУДЭНЦКАГА ЎЗРОСТУ ДА АКТЫВІЗАЦЫІ АДАПТАЦЫЙНЫХ ПРАЦЭСАЎ

The article dwells upon the psychological peculiarities of students. The knowledge of these peculiarities will help to get students adapted to their studies at a higher educational institution, to diminish cases of their expelling and to give them an adeguate guidance in education.

К.Дз.Ушынскі лічыць узрост ад 18 да 25 гадоў самым вырашальным для чалавечага лёсу, гэта лёсаносны перыяд у жыцці чалавека. Ён мае свае характэрныя асаблівасці. Студэнцтва — спецыфічная сацыяльная група, якая характарызуецца пэўнымі умовамі пражывання, мае цэласныя арыентацыі. Кажуць, што па ўзроўні студэнцтва можна меркаваць аб развіцці краіны.

Сярод асаблівасцей можна вылучыць натуральныя і сацыяльныя фактары, якія характарызуюць гэты ўзрост. Да натуральных можам аднесці якасці, звязаныя з прыродным развіццём.

Да сацыяльных асаблівасцей студэнцкага ўзросту можам аднесці наступныя: залежнае становішча — ад дапамогі сям'і, ад стыпендыі; частую прысутнасць тэндэнцыі спажывальніка (не прывучаны клапаціцца аб іншых, інфантылізм, які датычыць абавязкаў); нізкую сталасць асобы; грамадска-палітычную актыўнасць (патрэбнасць у грамадска-палітычных зносінах).

Сярод студэнтаў шмат акцэнтуяваных асоб. У 1976 г. псіхолаг Рожэнец вывучыў асаблівасці адлічаных студэнтаў. Гэтае даследаванне ён правёў на базе Ленінскага р-на г. Масквы, карыстаючыся методыкай Леангарда. Ён падзяліў усіх адлічаных студэнтаў на тры групы: 1) акцэнтуяваныя

асобы; 2) неакцэнтуяваныя; 3) нервова-псіхічныя, якія з'явіліся з ліку першай групы — іх 70 . Звяртаючы ўвагу на перавагу адлічэнняў з трэцяй групы, лічыць, што неабходна папярэдзіць неапраўданыя адлічэнні з ВНУ з-за акцэнтуяванасці асобы, якая мае наступныя акцэнты: педантызм, "клопат аб таварышу"; рэгіднасць асобы — алгарытм дзеяння засвойвае, але не здольны да арыгінальнасці; дэманстратыўнасць — дэманстратыўныя якасці ўласцівасцей асобы; цыклатэмікі — якія хутка пераходзяць ад захаплення да ўпадку; аўтычныя — замкнёныя, пагружаныя ў сябе: а) інтраверты — звернутыя ў сябе і б) упіваюцца уладай над знакамі (замыкаюцца у сабе, гуляюць у камп'ютэрныя гульні, вядуць дыялогі з машынай); некіравальныя — "грымучыя змеі"; змешаныя — камбінацыі некаторых з названых якасцей.

Варта ведаць, што нельга лічыць такія праяўленні капрызамі — гэта сутнасць асобы, якая часта нават не ведае гэтых сваіх якасцей, праз іх рэалізуе сябе ў соцыуме, і варта спакойна ставіцца да самых неардынарных або невытлумачальных учынкаў асобы студэнта, спрабуючы знайсці матывы паводзін, рэакцыі на рэплікі, пры сур'ёзных выпадках звяртацца да псіхолага, наладзіць больш строгі медыцынскі кантроль. Ведаючы прычыны, накіроўваць энергію ў патрэбнае рэчышча.

Вывучаючы асаблівасці юнацтва, І.І. Мечнікаў прыйшоў да высновы, што ў юнацтве пры нармальных умовах жыцця інстынкт захавання жыцця недастатковы і юнацтву ўласціва прыродная дысгармонія. Жаданні і імкненні развіваюцца раней, чым воля, характар. Гэта робіць яго падобным да дзіцяці.

Асноўныя супярэчнасці, належныя студэнцкаму ўзросту, вызначыў псіхолаг Ю.А.Самарын. 1. Гэта сацыяльна-псіхалагічныя супярэчнасці паміж росквітам фізічных і інтэлектуальных сіл студэнта і абмежаванымі магчымасцямі (сацыяльна-эканамічнымі і лімітам часу). 2. Паміж імкненнем да самастойнасці ў адборы ведаў і жорсткім раскладам (не паспяваюць развівацца творча, патрэбна шукаць больш гібкія формы). 3. Агромністая колькасць інфармацыі пашырае аб'ём ведаў, але часта вядзе да павярхоўнасці ведаў, бо няма часу, каб іх сістэматызаваць (адсюль успрынятае студэнтаў такое, што яны ўсё ведаюць). 4. Асабліва моцна праяўляецца патрэба ў самаўсталяванні асобы, таму што юнацкая пара і ёсць перыяд самасцвярджэння, у які назіраецца павышанае пачуццё ўласнай годнасці, самаўпэўненасць, саманадзейнасць, жаданне быць арыгінальным — гэта імкненне часта дае шмат нядобрых выхадак, учынкаў.

Псіхолагі вызначаюць наступныя тыпы і скіраванасці асобы: 1) стваральніка, які сцвярджае сябе грамадска-каштоўнымі справамі, мае правільныя маральныя арыентацыі, гэта — грамадска-каштоўны тып; 2) спажыўца, для якога галоўнае імкненне да назапашвання, але сярод іх выдзя-

ляюць працаўнікоў і дармаедаў; 3) разбуральніка, які сцвярджае сябе за кошт нанясення ўрону іншым людзям, атрымлівае задавальненне ад прыніжэння іншых, гэта зладзеі, фашысты і інш.

Названыя тыпы не абсалютныя. Патрэбна глядзець, чаго больш у асобе. Увогуле ж, аснова структуры асобы — скіраванасць, перавага рыс пэўнага тыпу. Пры рабоце ў студэнцкай групе метадам назірання можна выявіць найбольш яркія тыпы і скіроўваць сваю дзейнасць на развіццё станоўчых рысаў асобы і карэкціроўку адмоўных, абапірацца на станоўчыя тыпы, з іх дапамогай здзяйсняць выпраўленне негатыўных рыс асобы на станоўчыя.

Шляхамі папярэджання негатыўнага ўплыву і стварэння стрэсавых сітуацый з'яўляецца добрая арганізацыя вучэбнага працэсу і наладжванне нармальных умоў пражывання. На маю думку, паспела неабходнасць стварыць кабінет псіхалагічнай адаптацыі для студэнтаў, дзе ў той жа час маглі б паглыбіць адукацыю ў галіне псіхалогіі і выкладчыкі, каб кожны, хто мае патрэбу, змог бы вырашыць праблемы адаптацыйнага характару.

Мы ведаем, што студэнты імкнуцца набыць адукацыю, праявіць сябе лепшым чынам у студэнцкім калектыве, але не кожнаму гэта пад сілу і не таму, што не хапае разумовых здольнасцей, а таму, што студэнт не ведае сваіх псіхалагічных асаблівасцей, не можа размеркаваць свой час, каб у пэўны тэрмін выканаць усе патрэбныя заданні і экзамены; недаацэнка або пераацэнка сябе таксама прыводзіць да непажаданых вынікаў і г.д. Усе набытыя негатыўныя аспекты можа ўбачыць і зняць вопытны псіхолаг, а мы будзем мець добрага студэнта і фізічна здаровага чалавека.

Імкненне даць студэнтам універсітэцкую адукацыю еўрапейскага узроўню вымагае ад выкладчыкаў гуманізацыі выкладання сваіх дысцыплін праз лепшую навуковую арганізацыю працы, выкарыстанне новых методык выкладання, групавой працы, індывідуальнага падыходу і г.д. З гэтай мэтай можна было б наладжваць рознага роду семінары або стварыць Універсітэт гуманітарна-культуралагічнага плана як форму павышэння кваліфікацыі, дзе вывучаліся б 1) агульная і сацыяльная псіхалогія; 2) этыка ўзаемаадносін у калектыве; 3) навуковая арганізацыя працы; 4) развіццё маўленчых здольнасцей і аратарскае майстэрства; 5) курсы тэалагічных дысцыплін; 6) методыка выкладання ў ВНУ, дзе можна было б сабраць знаходкі ў гэтай галіне кафедр універсітэта.

Працуючы ў ВНУ, выкладчык павінен увесь час не толькі паглыбляць свае веды і ўдасканальваць методыку выкладання дысцыплін, але, ведаючы псіхалагічныя асаблівасці студэнтаў, скіраваць іх паводзіны і дзейнасць у галіне адукацыі ў патрэбнае рэчышча, паскорыць працэс адаптацыі студэнта да ўмоў ВНУ, зменшыць колькасць адлічэнняў.